УДК 372.881.1

# ВЫКАРЫСТАННЕ ІНАВАЦЫЙНЫХ МЕТАДАЎ НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ Ў ПАЧАТКОВЫХ КЛАСАХ

***В. А. Вінакур*** (ГПК МДУ імя А. А. Куляшова)
Навук. кір. ***С. В. Старавойтава***,
выкладчык

Да сучасных педагагічных тэхналогій, якія можна выкарыстоўваць на ўроках беларускай мовы, адносіцца тэхналогія развіцця крытычнага мыслення. Прыкладам развіцця крытычнага мыслення з'яўляецца кластар. Кластар – гэта графічная форма арганізацыі інфармацыі, калі выдзяляюцца асноўныя сэнсавыя адзінкі, якія фіксуюцца ў выглядзе схемы з абазначэннем усіх сувязей паміж імі [1].

У працэсе выкарыстання кластара фарміруюцца і развіваюцца наступныя ўменні: уменне ставіць пытанні, выдзяляць галоўнае, устанаўліваць прычынна-выніковыя сувязі, параўноўваць і аналізаваць, праводзіць аналогіі.

Прыём кластара можа выкарыстоўвацца на любым этапе.

Мэта першага этапа – узнаўленне ведаў па дадзенай тэме і пастаноўка пытанняў, на якія хочацца знайсці адказы.

На фазе асэнсавання арганізуецца работа з інфармацыяй. Выкарыстанне кластара дазваляе структурыраваць вучэбны матэрыял.

На стадыі рэфлексіі метад кластара выконвае функцыю сістэматызацыі атрыманых ведаў.

Прыклад кластара пры вывучэнні змянення назоўнікаў жаночага роду з канчаткамі –а, -я па тэме "Родны склон":




Урокі з выкарыстаннем метаду кластара даюць вучням магчымасць праявіць сябе, выказаць сваё меркаванне, сваё бачанне пытання, творча дзейнічаць.

## Літаратура

1. **Бабанский, Ю.К.** Методы обучения в современной общеобразовательной школе / Ю.К. Бабанский. – Минск : Просвещение, 2003. – 130 с.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова